праекты

# Вяртанне рарытэтаў

**На выстаўцы «Кнігазбор Храптовічаў: на шляху вяртання», якая адкрылася ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, упершыню прадстаўлены ўнікальная сямейная перапіска XIX стагоддзя і кнігі са знакамітай бібліятэкі Храптовічаў у Шчорсах.**

Лісты прадстаўнікоў роду Храптовічаў і тры кнігі былі вернуты ў Беларусь з Германіі ў лютым мінулага года і з таго часу захоўваліся ў Нацыянальнай бібліятэцы. Гэтая падзея адбылася дзякуючы намаганням дабрачыннага фонду «Шчорсы і Храптовічы». Некалі ўнікальны кнігазбор, пачатак якому паклаў канцлер Вялікага Княства Літоўскага Іахім Літавор Храптовіч у XVIII стагоддзі, лічыўся адной з найбагацейшых бібліятэк ва Усходняй Еўропе.




Як старажытныя кнігі, так і перапіска на французскай мове, — каштоўныя помнікі свайго часу, якія дагэтуль не дэманстраваліся публіцы і нідзе не публікаваліся. Летась са згоды апошніх уладальнікаў адшуканыя каштоўныя дакументы адправіліся ў Беларусь. Падчас адкрыцця выстаўкі і адбылася афіцыйная перадача рарытэтаў на захоўванне ў Нацыянальную бібліятэку.

На брыфінгу для журналістаў прадстаўнікі галоўнай кніжніцы краіны і дабрачыннага фонду «Шчорсы і Храптовічы» распавялі пра першы вопыт вывучэння кніг і ліставання Храптовічаў, звярнулі ўвагу на іх значэнне для беларускай і сусветнай культуры. Прысутныя пачулі пра новыя крокі ў вывучэнні гісторыі роду Храптовічаў, яго спадчыны ў Беларусі і замежжы, шляхі яе вяртання на радзіму.

На выстаўцы таксама прадстаўлены мастацкія работы студэнтаў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, якія ў якасці валанцёраў два гады запар працавалі летам на добраўпарадкаванні маёнтка Храптовічаў у Шчорсах.

**Міра ІЎКОВІЧ**